6. *Мальцев, В.* Марк Шагал – художник театра (1918–1922 гг., Витебск – Москва) / В. Мальцев // Шагаловский международный ежегодник. – Витебск, 2002. – С. 8–22.

7. Марк Шагал и сцена. Каталог произведений выставки. – Pariz : ADAGP, 2004. – 52 с.

8. *Маршессо, Д.* Шагал / Д. Маршессо ; пер. с фр. Л. Бурмистровой. – М. : ООО «Издательство Астрель» : ООО «Издательство АСТ», 2003. – 176 с.

9. *Сулима, А. Н.* Сценография и «режиссура» М. Шагала в балетном театре / А. Н. Сулима // Культура. Наука. Творчество : сборник научных статей / Белорусский государственный университет культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2014. – [Вып. 8]. – С. 166–170. – Библиогр. : с. 170.

10. *Хаггард, В.* Моя жизнь с Шагалом: Семь лет изобилия / В. Хаггард ; пер. с англ. Е. Серегиной. – М. : Текст, 2007. – 223 с.

***Т. Ф. Сухоцкая,***
*кандыдат культуралогіі*

# ГІСТАРЫЧНАЯ ТЫПАЛОГІЯ ЎТАПІЧНАГА МЫСЛЕННЯ

Сапраўдны сэнс чалавечага існавання заўсёды адлюстроўваюць духоўныя ідэалы, найбольш дзейсным з'яўляецца ўтапічны. Менавіта ён задае інтэнцыю сацыягенезу, культурагенезу. З'яўляючыся важным кампанентам менталітэту, ён адлюстроўваецца найперш у мастацкай культуры і грамадскай думцы, уплывае на нацыянальную свядомасць і сацыяльную актыўнасць, адыгрывае істотную ролю ў фарміраванні соцыума і асобы як суб'ектаў культуры. На розных этапах гістарычнага развіцця ўтапічны ідэал часта актывізуе стварэнне новых формаў культуры.

Сацыяльная эвалюцыя і інтэграцыя славянскіх плямёнаў ў другой палове першага тысячагоддзя новай эры суправаджалася пераасэнсаваннем і актуалізацыяй ранняга варыянту ведычнай міфалогіі. У язычніцкія часы космас быў падзелены на «гэты» і «той» светы. Прыярытэт непахісна аддаваўся першаму. З прыходам хрысціянства не проста сцвярджаецца існаванне «таго свету», але і вечнае жыццё пасля смерці, калі ты прыняў новую веру. Найперш у хрысціянстве продкі беларусаў вылучалі прыгажосць, весялосць, яскравасць абрада богаслужэння – тое, што вызначае сутнасць старажытнага язычніцкага светапогляду.

Узорам грамадскага ладу ва ўсходніх славян абвяшчаўся Ірый (вырай, рай), размешчаны за ракою Ра (Волгай), высока ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рыпейскіх гарах. Там жывуць багі і героі, якія сцвердзілі права светлай Яві і перамаглі ўладу цёмнай Наўі (Наўды, Нуды). У Вырый-сад душы памерлых праводзіць маленькі бог Водзец. Там расце сусветнае дрэва (нашы продкі думалі, што гэта бяроза ці дуб) з маладзільнымі яблыкамі, ёсць студні з чыстай крынічнай вадой – жывой і мёртвай. З Ірыю буслы прыносяць немаўлят, у якіх увасобілася душа раней памерлых. Ірый-птушкамі лічаць першых вясновых птушак, звычайна жаваронкаў, якія нясуць вясну з райскіх садоў.

Беларускі народны ідэал увасоблены найперш у казках. Фальклорная аксіялогія сцвердзіла каштоўнасную сутнасць жыцця, адкрыла глыбіні і высі духоўнай повязі чалавека з Сусветам. Жыццятворны і жыццесцвярджальны патэнцыял народнай культуры адкрывае і сёння перспектывы далейшай эвалюцыі чалавецтва, наглуха замкнёныя ў нігілісцкіх і прагматысцкіх канцэпцыях нашага часу.

Як бачым, у разуменні нашых продкаў топасы «той свет», «вырай» з'яўляюцца першымі формамі адлюстравання ўтапічнага ідэалу. Найвышэйшай ступенню яго выражэння ў беларускай культуры стала ідылія, «сялянка». У Сыракомля, А. Плуг, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч у сваіх творах ствараюць ідэал ідылічнага суіснавання добрага, адукаванага пана і паслухмянага, працавітага селяніна. Амаральнай сучаснасці Я. Баршчэўскі супрацьстаўляў ідэалізаванае мінулае, часы шляхецкай, часткова сялянскай патрыярхальнасці, у якіх бачыў рэальную альтэрнатыву імперскаму парадку. У сваіх творах даказваў правільнасць прынцыпаў існавання чалавека ў свеце, выпрацаваных хрысціянствам: прыярытэт духоўнага над матэрыяльным; класавы салідарызм; аўтарытэт продкаў [1, с. 12]. Такім чынам, трэба адзначыць, што тэндэнцыю да ідыліі, як формы ўтопіі, мела найперш сялянская паэзія. Гэтым і тлумачыцца наяўнасць ідылічных элементаў, матываў, вобразаў ў беларускай літаратуры – арганічнага кампанента ў сістэме каштоўнаснага пазнання.

Старажытнаегіпецкая культура, прасякнутая ідэяй бессмяротнасці, стварыла арыгінальную форму ўтопіі – «кнігу мёртвых» (піраміду), якая рабіла ўсіх людзей поўнасцю роўнымі перад адной ілюзіяй. Гэтым абумоўлены выбар граніту і базальту ў якасці матэрыялаў для збудаванняў, у захаванні цела памерлага праз складаную працэдуру муміфіцыравання, ва ўвекавечванні

яго асобы ў партрэтных статуях. Як пратэст супраць смерці ўзнік заўпакойны культ, нарадзілася ідэя ўваскрасення з мёртвых. Змест ўтапічнага ідэалу абумоўлены імкненнем смяротнага дасягнуць бессмяротнасці багоў. Каштоўнасці зямнога жыцця распаўсюдзіліся і на замагільны свет: не адмаўлялася фізічная прыгажосць і задавальненні. У егіпецкай утопіі ўсіх чакала вечнае жыццё, царскае, бо кожны ператвараўся ў Асірыса, і сапраўды боскае – кожны стане спадарожнікам Ра (Сонца).

Утапічным ідэалам у будызме была аб'яўлена нірвана як адзіная магчымасць спыніць жыццёвыя пакуты, а гэта – уцёкі і адмова ад чалавечых зямных клопатаў. Сэнсавае напаўненне дадзенага канцэпту шматзначнае. Большасць даследчыкаў схільныя ўспрымаць нірвану як абсалютнае знішчэнне існавання. Аднак у эзатэрычных тлумачэннях – гэта стан абсалютнага існавання і абсалютнай свядомасці, куды Эга чалавека, які пры жыцці дасягнуў вышэйшай ступені дасканаласці і святасці, уваходзіць пасля смерці цела, а часам, як у выпадку з Будай, і пры жыцці.

На фоне татальнага жадання прыхільнікаў будызму вырвацца за межы рэальнасці беларускі ўтапічны ідэал не выносіцца за межы чалавечага свету і не бярэцца з трансцэндэнтнага свету, а вырастае з рэальнага, зямнога жыцця. Беларуская народная філасофія выпрацавала ўяўленні аб ідэале, які бачыўся ў спалучэнні шматлікіх станоўчых якасцей – жыць у згодзе з людзьмі і акаляючым асяроддзем, любіць Бацькаўшчыну, жыць па праўдзе, быць гаспадаром, быць людскім. Беларуская ўтопія, «казка жыцця», магчыма ў зямным быцці чалавека. Яе рэалізацыя залежыць толькі ад крэатыўных магчымасцей асобы.

Новае пакаленне беларускага этнасу мае магчымасць убачыць праз прызму нацыянальнай культуры сэнс чалавечага жыцця, сэнс мары беларусаў, перспектывы самарэалізацыі ў духоўнай і сацыяльнай прасторы. А з гэтага вынікае, што сучасная рэформа адукацыйнай сістэмы будзе эфектыўнай пры ўмове, калі ў яе аснову будзе пакладзена арыентацыя на раскрыццё дзейснай сілы і хараства нацыянальнага ідэалу.

---

*Даніленка, С. І.* Сакралізацыя вобраза Радзімы ў беларускай літаратуры першай паловы ХІХ ст. (У творах Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча) : аўтарэф. дыс. … канд. філал. Навук : 10.01.01 / С. І. Даніленка ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 1997. – 19 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ